**Надзея Давыдзік**

Загадчыца аддзела
Гродзенскай абласной
навуковай бібліятэкі
імя Я.Ф. Карскага

# Чытаем беларускую кнігу




Прапаганда беларускай мовы і літаратуры, захаванне і ўзбагачэнне гісторыка-культурнай спадчыны, прывіццё любові да роднай зямлі – важныя задачы ў дзейнасці кожнай бібліятэкі.

З мэтай павышэння ролі публічных бібліятэк у папулярызацыі беларускай літаратуры ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага» аб'явілі сярод цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм вобласці конкурс «Чытаем беларускую кнігу», які разлічаны на 2011–2012 гг.

Работа ў межах конкурсу ў 2011 г. актывізавала пошук і ўкараненне інавацыйных форм і метадаў работы, сучасных інфармацыйных тэхналогій, доўгатэрміновых праектаў (супольна з іншымі арганізацыямі і ўстановамі), якія накіраваны на павышэнне якасці і колькасці камплектавання бібліятэчных фондаў беларускамоўнымі выданнямі, а таксама садзейнічала павелічэнню кнігавыдачы літаратуры на беларускай мове, развіццю навукова-даследчай і рэкламнай дзейнасці.

Высокай ацэнкі заслугоўвае работа Навагрудскай ЦБС, якая па выніках конкурсу атрымала Дыплом I ступені. Супрацоўнікамі бібліятэчнай сістэмы быў распрацаваны праект «Адкрый для сябе беларускую кнігу», разлічаны на два гады. Асноўная мэта яго – абуджэнне цікавасці і любові да беларускай мовы і беларускай мастацкай кнігі, пашырэнне чытацкага попыту на яе. Было праведзена даследаванне складу і выкарыстання бібліятэчнага беларускамоўнага фонду, зроблены высновы, вызначаны асноўныя кірункі работы па папулярызацыі пэўных жанраў літаратуры.

Дзіцячы чытач знаёміўся з творамі з дапамогай электроннай гульні «Скарб – у кнізе, кніга – скарб», распрацаванай работнікамі ЦБ.

Супрацоўнікі Навагрудскай ЦБС праводзілі шырокую рэкламную кампанію па папулярызацыі навінак беларускай літаратуры. Рэкламаваць беларускую кнігу запрашаліся кіраўнікі аддзелаў райвыканкама, прадпрыемстваў і ўстаноў горада. Іх водгукі размяшчаліся на сайце ЦРБ і дошцы інфармацыі бібліятэкі.

З задавальненнем наведвальнікі бібліятэк прынялі ўдзел і ў фотаконкурсе «Навагрудчына чытае беларускую кнігу».

Важкі ўклад у папулярызацыю беларускай кнігі і чытання на роднай мове ўнеслі бібліяграфічныя радыёагляды, матэрыялы ў друку і на тэлебачанні, падрыхтаваныя супрацоўнікамі ЦБ.

Актыўнае прымяненне сучасных інфармацыйных тэхналогій адлюстроўваў цікавы матэрыял, прадстаўлены Лідскай ЦБС (уладальніца Дыплома II ступені). Была рапрацавана мэтавая праграма «Гартаючы каляндар», у межах якой рыхтаваліся цыклы радыёгутарак «Бібліятэка ля мікрафона», прысвечаныя юбілейным і памятным датам беларускага








літаратурнага календара. Інфармацыю аб навінках літаратуры можна было знайсці на старонках раённай і рэспубліканскай прэсы – «Лідская газета», «Прынёманскія весці», «Наша слова», «Культура», «Бібліятэка прапануе» і г. д. Акрамя таго, свой уклад у рэкламную кампанію ўнесла правядзенне прамоўшэн-акцыі – распаўсюджванне рэкламных лістовак-заклікаў да чытання сярод юных наведвальнікаў бібліятэк.

Папулярызацыі беларускай літаратуры і мовы садзейнічала правядзенне раённага бібліятэчнага конкурсу «Сэрцам роднага слова краніся». Тут перавага аддавалася крэатыўным формам работы. Гэта і цікавыя пастаноўкі беларускіх народных казак лялечным тэатрам «Пятрушка», і конкурс чытальнікаў вершаў «А сама найперш – дзеці», і літаратурны брэйн-рынг па творчасці пісьменнікаў, і выданне намаганнямі бібліятэкі друкаваных зборнікаў творцаў слова.

Заслугоўвае асаблівай увагі праект Лідскай ЦБС сумесна з гарадской школай № 10 «Бібліятэка і школа: тэрыторыя чытання». Цікавасць да літаратуры падтрымліваецца разнастайнымі формамі работы з прымяненнем электронных тэхналогій. Бібліятэкары распрацоўвалі экспрэс-віктарыны, літаратурныя конкурсы, акцыі, сюжэтныя відэаролікі, мультымедыйныя прэзентацыі, гульні, урокі радзімазнаўства, віктарыны, конкурсы і інш. Усе пытанні віктарын, конкурсаў складаліся такім чынам, каб адказы можна было знайсці толькі ў кнігах.

Падчас правядзення разнастайных конкурсаў вучням было прапанавана праявіць свае таленты ў розных галінах: напісаць рэцэнзію на любімую беларускую кнігу, хутчэй за ўсіх прачытаць кнігі са спіса пазакласнага чытання, скласці аўтарскі верш на беларускай мове і інш.

Не засталіся па-за ўвагай і жыхары аддаленых маланаселеных пунктаў. З дапамогай бібліёбуса праводзілася акцыя «Беларускай кнізе – сельскі адрас» (была арганізавана выстава твораў беларускіх класікаў, перыядычных выданняў з бібліяграфічным аглядам прадстаўленага матэрыялу).

Вынікам плённай працы супрацоўнікаў Лідскай ЦБС стаў выпуск мультымедыйнага дыска «Чытаем беларускую кнігу», у склад якога ўвайшлі разнастайныя па форме і змесце медыйныя прэзентацыі, сюжэтныя відэаролікі па творах беларускіх аўтараў, якія вывучаюцца ў межах школьнай праграмы. Дадзены матэрыял з'яўляецца добрым дапаможнікам пры правядзенні масавых мерапрыемстваў установамі культуры і адукацыі.

Трэці пераможца конкурсу (Дыплом III ступені) – ЦБС Гродзенскага раёна, якая ажыццяўляла папулярызацыю роднай мовы і літаратуры падчас разнастайных мерапрыемстваў з прымяненнем мультымедыйных прэзентацый і відэаролікаў («Беларускія пісьменнікі – дзецям», «Паэт народа – Максім Багдановіч», «Чытаем беларускую кнігу» і г. д.).

Запамінальнымі для наведвальнікаў сталі «Хіт-парад навінак кніг беларускай дзіцячай літаратуры» і ўрок-падарожжа «Запрашаем у сэрца Еўропы: беларускія замкі» і г. д.

Праведзенае экспрэс-апытанне «Ці чытаеце Вы беларускія кнігі?» паказала, над чым неабходна працаваць бібліятэкарам, якую літаратуру набываць, якіх аўтараў актыўней рэкламаваць.

Пастаяннымі гасцямі бібліятэк сістэмы былі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі. На сустрэчах прэзентаваліся новыя творы і актыўна абмяркоўваліся з чытачамі прачытаныя.

Актыўна рэкламавалася беларуская кніга праз СМІ, сайт аддзела культуры райвыканкама, а таксама з дапамогай перасоўнай бібліятэкі.

Плённую работу супрацоўнікаў ацанілі не толькі чытачы бібліятэк, але і прадстаўнікі іншых арганізацый і ўстаноў, якія дзяліліся сваімі ўражаннямі, пакідалі словы падзякі ў кнізе водгукаў.

Такім чынам, мерапрыемствы ў межах абласнога конкурсу «Чытаем беларускую кнігу» садзейнічалі якаснаму і колькаснаму фарміраванню беларускамоўнага фонду, павелічэнню наведванняў і кнігавыдачы публічных бібліятэк.

Але на дасягнутым нельга спыняцца. У Год кнігі конкурс працягваецца. Трэба крочыць далей, адкрываць новыя старонкі скарбніцы ведаў – БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ.

**Summary**

By the example of Grodno region libraries author presents the events that are scheduled for the Book Year and are aimed at promotion of Belarusian language and literature, and spreading readers' interest to native writers.

